База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# Надпісы на сценах Гомельскай турмы перыяду нацысцкай акупацыі Беларусі: рассакрэчаныя звесткі НКУС СССР

*У 2014 годзе спаўняецца 70 гадоў з часу вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нацысцкай акупацыі. Аднак і сёння адкрываюцца дагэтуль засакрэчаныя дакументы, якія дапаўняюць нашы веды пра многія старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.*

Нагодай для напісання дадзенага артыкула стала знаёмства з раней невядомымі гісторыкам архіўнымі матэрыяламі. Ад украінскай даследчыцы, доктара гістарычных навук Т. В. Вронскай я даведаўся, што ў Маскве захоўваюцца архіўныя справы, якія ўтрымліваюць скапіраваныя тэксты надпісаў, зробленых на сценах турмаў у перыяд нацысцкай акупацыі тэрыторыі СССР. Шчыра кажучы, спачатку гэтая інфармацыя мяне не зацікавіла. Узнікла пытанне аб тым, што новага можа быць у гэтых справах. Яшчэ ў 1961 г. пабачыла свет кніга "Говорят погибшие герои: предсмертные письма советских борцов против немецко-фашистских захватчиков (1941-1945 гг.)", дзе акрамя лістоў былі апублікаваны і многія надпісы са сцен гітлераўскіх турмаў, у тым ліку з тэрыторыі Беларусі. Яна вытрымала 9 выданняў, агульны тыраж якіх перавысіў 2,6 млн экзэмпляраў.

Аднак Тамара Васільеўна абвергла мае сумненні. Яна паведаміла, што гаворка ідзе аб нядаўна рассакрэчаных дакументах Турэмнага ўпраўлення (ТУ) Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) СССР, якія ўтрымліваюць каштоўную інфармацыю як па гісторыі антыфашысцкага супраціўлення, так і па гісторыі ваеннай паўсядзённасці.

І сапраўды, падчас працы з дакументамі фонду Турэмнага ўпраўлення НКУС СССР у Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі быў выяўлены вялікі матэрыял, які патрабуе значнай працы па пошуку звестак аб асобах, якія пакінулі надпісы. Трэба быць вялікім аптымістам, каб спадзявацца на поспех, але абавязак гісторыка патрабуе паспрабаваць аднавіць з небыцця хоць адно добрае імя.

Знаёмства з матэрыяламі архіўных спраў паказала, што па ініцыятыве непасрэднага кіраўніцтва Турэмнага ўпраўлення НКУС СССР (начальнік-камісар дзяржаўнай бяспекі М. І. Нікольскі) у жніўні 1943 г. перыферыйным органам было дадзена ўказанне, каб па меры вызвалення Чырвонай арміяй савецкіх гарадоў быў праведзены ўважлівы агляд турэмных памяшканняў на прадмет выяўлення на сценах камер надпісаў, зробленых вязнямі гэтых турмаў падчас акупацыі. Скапіраваныя на месцах надпісы неабходна было накіроўваць у Маскву. Можа ўзнікнуць натуральнее пытанне: навошта было гэта рабіць?

Высвятляецца, што Турэмнае ўпраўленне ўзяло на сябе ініцыятыву правесці адпаведную праверку на месцах асоб, на якіх меліся "ўстановачныя даныя" (г. зн. прозвішча, імя, адрас, месца працы і г. д.), з мэтай інфармавання мясцовых органаў НКУС — МДБ (Міністэрства дзяржаўнай бяспекі) аб тым, што гэтыя людзі сядзелі ў турмах і маглі быць завербаваныя немцамі. Аб праведзенай у гэтым кірунку працы і аб папярэдніх выніках пошуку можна даведацца з дакладной запіскі начальніка ТУ НКУС СССР М. Нікольскага на імя наркама НКУС генеральнага камісара дзяржаўнай бяспекі Л. Берыі, якая датуецца 25 сакавіка 1945 г.: *"Докладываю на Ваше распоряжение записи на стенах камер, произведенные содержавшимися в тюрьмах во время немецкой оккупации. Осмотр тюремных помещений производился немедленно по мере освобождения советских городов от немецко-фашистских войск. Обнаружено и заактировано 2180 пофамильных записей. 387 записей*

*содержат в себе краткие установочные данные авторов. Указанные записи были скопированы в 46 тюрьмах НКВД — УНКВД. Через органы НКГБ были произведены установки на 102 человека, содержавшихся в тюрьмах при немцах.* ***В целях выявления немецких агентов, вербованных из контингента, содержавшегося в тюрьмах, нами проведена выборочная проверка.*** *Проверкой 6 человек установлено находящимися на службе в Красной Армии и 3 работающих в советских учреждениях.* ***Все они скрывают свое пребывание в тюрьмах во время немецкой оккупации. По нашим ориентировкам соответствующие органы контрразведки НКО, НКВД и НКГБ выявленных лиц взяли в агентурную разработку*** (Асобныя сказы выдзеленыя аўтарам артыкула. — А.Л.). Л. Берыя падтрымаў ініцыятыву М. Нікольскага, аб чым сведчыць яго рэзалюцыя на дакуменце: *"Заслужива-ет внимания. Представьте предложения об установке названных лиц. Не исключено, что такие надписи и в других тюрьмах и Германии".*

Як бачым, аўтара запіскі М. Нікольскага і наркама Л. Берыю гэтыя надпісы цікавілі толькі з аднаго боку — выяўленне асобаў, якіх маглі завербаваць немцы. Тое ж, што сярод вязняў турмаў былі сапраўдныя савецкія патрыёты. якія аддалі сваё жыцці за Радзіму, яны ўвогуле не ўзгадвалі.

У архіве ТУ НКУС СССР захоўваюцца справы са скапіраванымі надпісамі. а таксама справы з матэрыяламі праверак пэўных асобаў. З прагледжаных намі архіўных спраў бачна. што алератыўным аддзелам Турэмнага ўпраўлення было ўсяго ўзята на асаблівы ўлік больш за 800 чалавек. якія пакінулі на сценах надпісы з найбольш поўнымі ўстановачнымі данымі.

***Невядома чаму, але ў поле ўвагі Турэмнага ўпраўлення трапілі толькі 10 турмаў БССР: у Гомелі, Пінску, Кобрыне, Магілёве, Віцебску, Оршы, Мінску, Стоўбцах, Лідзе, Навагрудку.*** Усяго ж у гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі ў розны час існавала каля сотні турмаў і месцаў прымусовага ўтрымання савецкіх людзей. Колькі іх было на самай справе, колькі ў іх было зроблена надпісаў і колькі з іх дакументальна зафіксаваныя. адназначна сказаць пакуль немагчыма. Найбольш поўныя на сёння звесткі аб колькасці турмаў і турэмных памяшканняў ёсць у даведніку, падрыхтаваным беларускімі архівістамі пад кіраўніцтвам У. Адамушкі. У ім прыведзена інфармацыя аб 75 турмах (12 па Брэсцкай, 12 па Віцебскай, 11 па Гомельскай, 7 па Гродзенскай, 16 па Мінскай, 16 турмаў і арыштанцкі дом па Магілёўскай вобласці). Аднак гэтая інфармацыя не з'яўляецца вычарпальнай.

У нас няма тлумачэнняў, чаму ў поле ўвагі работнікаў Турэмнага ўпраўлення не трапіла асноўная частка турмаў Беларусі і нават многія камеры з тых турмаў, якія абследаваліся на прадмет надпісаў (10 турмаў Беларусі). У дадзеным артыкуле аўтар коратка пазнаёміць чытачоў з надпісамі, знойдзенымі ў Гомельскай турме, матэрыяламі праверкі аператыўным адазелам ТУ НКУС СССР асобаў, якія пакінулі аб сабе "установачныя даныя", і вынікамі ўласнага пошуку інфармацыі аб гэтых людзях у апублікаванай літаратуры і архіўных дакументах.

За гады нацысцкай акупацыі праз турму г. Гомеля прайшла вялізная колькасць людзей, а непасрэдна перад прыходам савецкіх войскаў тут было расстраляна больш за тысячу вязняў. Горад Гомель быў вызвалены ад гітлераўскіх захопнікаў 26 лістапада 1943 г. - першым з абласных цэнтраў БССР. Прызначаная савецкая адміністрацыя турмы правяла

абследаванне камер і зрабіла копіі надпісаў са сцен. Спіс з гэтымі надпісамі быў затым адасланы ў Маскву. Прывядзем яго поўнасцю, з захаваннем стылю і пунктуацыі. Тлустым шрыфтам выдзелены тыя прозвішчы, аб уладальніках якіх нам ужо ўдалося сабраць пэўныя звесткі.

*"ТЮРЬМА* г. *ГОМЕЛЯ, УНКВД ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛ., БССР*

*Камера № 1.*

*С 18 июня по 30 августа сидели Афанасьев* Ф.Ф., *Михеев В. И.*

***Дорошенко С.Р.***

*Холопченко П.* С.

***Попов Е.***

*Головченко Адам. Морзе азбуку написал телеграфист Головченко.*

*Камера № 14.*

***Толкачев Николай*** *погиб 26 сентября 1943 г.*

*Чуянов Григорий, погиб 26 сентября 1943 г.*

*26 сентября 1943 г. погиб Войтенко Д.К.*

*Камера № 18.*

*Павлович Казимир Ф. Минской области, Дзержинский район, Новоселковский сельсовет, дер. Макович. 25 сентября 1943 г. (г. Дзержинск).*

*25 апреля 1943 г. вывезено с СД 8 машин на расстрел.*

***Григорий, Аникей, Галя*** *и ост[альная] семья расстреляны* ***Шугалевы*** *из С [а] венки, Ветковского района, расстреляны 25 сентября 1943 г. за связь (гор. Ветка, Гомельской области).*

*Камера 2-го корпуса.*

*Позняков Петр Поликарпович, рождения 1921 года, Тереховка. 25 сентября 1943 г. — погиб.*

*Корпус №2.*

*Камера № 1.*

*Митенко Анисим.*

*Камера № 2.*

*Куколов Сергей.*

*Андриевский М.М., Клинцы, прибыл 21 июня, расстрелян 26 сентября 1943 г.*

*Тарнушенко Мария, выбыла 26 сентября 1943 г.*

***Алексеенко Алексей Калинович,*** *погиб 25 августа 1943 года, расстрелян.*

*Приходько Федор, расстрелян 26 сентября 1943 г.*

*Дюкарев Д.П., 13 апреля 1943 г.*

*Максименко С.М. 6 мая 1943 г.*

*Моргунов В. 7.8 — 17 февраля 1942 г.*

*Ковалев Федор Иванович.*

*Малышев Владимир, 1919 из Новозыбкова, забран 20 февраля 1943 г. судьба решилась 7 мая 1943 г. (Брянской области).*

*Куприянчик М.А. 16 июля.*

*Сегодня 90 суток, а допроса все нет — Устенков забран 10 июня 1943г.*

***В.Глушаков*** *17 августа 1943 г.*

*Ходаков*

*Редкий Ник. Вас., Саратов, Б. Казачья, 43, расстрелян 26 сентября 1943 г.*

***Пастушенко Андрей Петрович,*** *Чечерский район, д. Отор, расстрелян 26 сентября 1943 г., кто может передайте родным (м. Чечерск, Гомельской обл.).*

***Дробышевский Федор Григорьевич****, Черский р-н, Наухавическая вол., д. Дубровка, расстрелян 26 сентября 1943 г.*

*Камера №3 женская.*

*Дуся Прохорова 17 сентября 1942 г.*

*Муся Моргунова арест. 6 августа в Новозыбкове. Валя Моргунов в Гомель прибыл 11 августа 1942 г. Татарина Прасковья из Новозыбкова.*

*Касаткина Анна.*

*С 26 сентября сидели Стрельцова Люба и ее дочь Нелли.*

*Камера № 4.*

*Фетисов Виктор, 1924 г., с 14 августа 1943 г. Мерзлое Валентин.*

*Огрызко И.Р.*

*Алейников.*

*Камера № 5.*

*Михаленко Анатолий был с 25 мая.*

*Баулин С. К. прибыл 6 мая 1943 г. убыл. Ярошевич М. Ф. прибыл 16 мая 1943 г., убыл 23 июня 1943 года.*

*Баулин В. К.*

*Милевский Л.*

*23 июля 1943 г. Маглышев.*

*Маглышев Миша Чечерск 23 июля 1943 г. выбыл 26 сентября 1943 г.*

*Милевский Анатолий Иванович, 10 октября 1943 г. Никитин И. А. прибыл 3 июня 1943 г. убыл.*

*Миша 13 мая 1943 г., 17 мая 1943 г.*

*Таня 13 мая 1943 г., 18 мая 1943 г.*

*Бесчастнов 31 мая 1943 г.*

***Борейша А.Л.** 21 мая 1943 г. убыл.*

*Солодкин А. В. 6 апреля 1943 г. убыл. Кузьминицкий Вас. Ар.*

*Клинов — Ардони заточен 22 июля 1943* г,

*К. В. Румянцев с 21 марта 1943 г.*

*Сухаринов Ив. Н.*

*Летяго Ив. П. 5 марта 1943 г. из Новозыбкова. Шевцов.*

*Костя матрос Балтики из воздушно-десантного отряда Комарова погиб 26 сентября 1943 г. расстрелян.*

*10 июня 1942 г. Алейников.*

*Громов К. М. прибыл 23 июня 1943 г.*

*Накалов Иван.*

*Зубарев Б. И. прибыл 3 августа — убыл.*

*Камеры 2-го корпуса.*

*№2.*

*Был Громов Иван.*

*№3.*

***Яночкин**.*

*1 корпус.*

*Камера № 18*

*Погиб 25 сентября 1943 г. с ним 30 чел. через расстрел. До свидания товарищи, помните фашистскую власть.*

*Дубовицкий Петр Павлович.*

*Вятка, ул. Средняя, 17 — Удалов Иван Данилович, посетил камеру 26 сентября 1943 г. Сидело 10 июня 1943 г. по 25 сентября 1943 г. (Гомельская обл.).*

*Сугонякин Федот М. Сивенко.*

***Ивановы Иван, Михаил, Валентина, Анна** расстреляны 25 октября 1943 г. — суббота.*

*Салов Валентин погиб 25 апреля 1943 г.*

*Добруш, Дедков Сергей Михайлович, 1921 г. рождения, сидел за связь, пущен в расход 25 сентября 1943 года, Шабловский Михаил Васильевич сидел за связь, пущен в расход 25 сентября 1943 г.*

*<u>В полуразрушенных камерах б. женского корпуса</u>.*

***Лебедев Павел** г. Гомель, Подгорная, 19, взяли на расстрел 24 сентября 1943 г., передайте Лебедевой Любе.*

*Сталинград, обл., Руднянский р-н, с. Рудня, Майская, 112 — Глушковой Марии Фед. — Владимир расстрелян.*

*Елисеенко Иван Ларионович — село Ути, Тереховского р-на, прибыл 12 сентября 1943 года. Сообщите родным до войны работал директором Случ-Миличанской школы (с. Терехов, Гомельск. обл.)*

*Роща Смольная, дом 1 Василевич Надя.*

*г. Добруш. ул. Гомельская, дом 11 **Гаврилюченко Петр** сидел с 23 августа 1943 г. 25 сентября 1943 г. расстрелян (Гомельская область).*

*Алтайский край. Барнаул — Короленко, д. 8 Шабанов расстрелян.*

*Алма-Ата, Каз. ССР, Пушкинская, 25 — **Ершов Дмитрий Андреевич**, расстрелян.*

*Усть-Каменогорская обл., Большенарыльский р-н, Малокрасноярский с/с — Назаров*

*расстрелян (Казах. ССР).*

*Тамбовская область, Ржаксинский район, Отхошенвский с/с. Чернов Иван Ан. расстрелян.*

*Кто первый увидит эту надпись, сообщите пожалуйста Гомель, Роща Смольная, д. 1 Василевич Наде. Погиб здесь в тюрьме 25 сентября Ермаков Николай Петрович из Москвы, сообщите через газету о моей гибели матери Ермаковой Анне Ильиничне, 1898 г.*

*Погиб Шляхов Иван Андреевич, сидел с 22 августа 1943 г. по 26 сентября 1943 г. неизвестно за что.*

Як бачым, нават павярхоўнае знаёмства са спісам паказвае, што ён утрымлівае розную каштоўную інфармацыю аб вязнях, іх родных, абставінах арышту, часе знаходжання ў заключэнні, далейшым лёсе.

Турма ў Гомелі дзейнічала з першых дзён нацысцкай акупацыі. Яна размяшчалася ў чатырох карпусах — былых будынках турмы УНКУС Гомельскай вобласці па адрасе вул. Савецкая, 73. У кожным з карпусоў мелася па 8-9 камер. У іх утрымліваліся вязні, якія лічыліся за пэўным карным органам. У турму накіроўвалі арыштантаў з камер папярэдняга заключэння тайнай ваеннай паліцыі, службы бяспекі СД, Жандармерыі, паліцыі парадку, а таксама чырвонаармейцаў з лагера ваеннапалонных. Пры адступленні з г. Гомеля немцы расстралялі ўсіх вязняў турмы — больш за тысячу чалавек.

З тысяч вязняў, якія ў розны час акупацыі сядзеліў турме, надпісы ёсць толькі аб 89 чалавеках. Яны распавядаюць аб трагічным лёсе савецкіх людзей, асабліва тых, хто трапіў за краты па падазрэнні ва ўдзеле ў партызанскай і падпольнай барацьбе.

Пакідаючы надпісы з адрасам сям'і, вязні спадзяваліся, што аб іх лёсе паведамяць тыя, каму пашчасціць выжыць. Невядома, ці адклікнуўся хто-небудзь на апошнюю просьбу М. П. Ермакова і расказаў Надзеі Васілевіч (Гомель, Гай Смольны, д. 1) аб яго лёсе, каб яна потым паведаміла яго маці "праз газету" ў Маскву.

Хто гэтыя людзі? За што яны апынуліся ў турме? Як склаўся іх далейшы лёс? Пошук адказаў на гэтыя пытанні і стаў асновай нашага даследавання. Ён праводзіўся па матэрыялах архіваў Рэспублікі Беларусь і апублікаваных звестках (у першую чаргу з кнігаў хронікі "Памяць"). На дадзены момант удалося знайсці інфармацыю толькі аб некалькіх асобах, ад- чак першыя вынікі абнадзейваюць.

Свбй расказ аб людзях, чые імёны былі выяўленыя на сценах Гомельскай турмы, пачнем з **камеры №1** (верагодна, чацвёртага корпуса). У ёй былі пазчачаны шэсць прозвішчаў. На дадзены момант звесткі сабраныя аб дзвюх асобах: **С. Р. Дарашэнку Я. Папове,** імёны якіх прыведзены ў хроніцы "Памяць". Так, у спісе членаў падпольнай арганізацыі г. Гомеля пад кіраўніцтвам Леаніда Іосіфавіча Лзегірэўскага пазначана: *Дарашэнка Сямён Раманавіч, н. у 1901 г., у арганізацыі з верасня 1941 па ліпень 1943, да вайны — ваеннаслужачыя.* У спісе загінулых удзельнікаў народнага апалчэння, падпольшчыкаў і партызан аб Л. Дзегірэўскім сказана, што ён "*кіраўнік падпольнай групы. Расстраляны ў верасні 1943".* Нам захацелася больш даведацца аб дзейнасці гэтай групы і лёсе С. Р. Дарашэнкі. Першая інфармацыя была выяўлена ў гістарычнай даведцы "Подвиг непокоренных. В коммунистическом подполье в городе Гомеле в годы Великой Отечественной войны (август 1941 — ноябрь 1943 г.)", падрыхтаванай Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Гомельскім гаркамам і апублікаванай у газеце "Советская Белоруссия' 21-22 чэрвеня 1973 г. У ёй дзейнасць групы Л. Дзегірэўскага ацэнена вельмі высока:

*"Смелые диверсии проводила группа во главе с участником гражданской войны Л. И. Дегиревским, работавшим до войны председателем исполкома Жлобинского районного Совета депутатов трудящихся. Кроме руководителя, в состав группы входили коммунисты С. Р. Дорошенко, С. В. Мельников, Е. А. Можейко. С. Ф. Поляков, И.К. Федоров, В. Ю. Чужов, П. Л. Шатило и другие патриоты. Группа имела низовые ячейки на железнодорожном узле, крупозаводе, в лесничестве. Подпольщики совершали диверсии, нарушали вражескую связь на линиях Гомель - Добруш, Гомель - Уза. В феврале 1943 года С. Р. Дорошенко, С. В. Мельников и Е. А. Можейко успешно осуществили диверсию на железной дороге. Они перевели стрелки на станции, вызвав этим столкновение двух поездов с живой силой врага между Моховым переездом и Кузнечным мостом. В июне 1943 года подпольщики подожгли продовольственный склад на Сенной улице. Вместе с партизанами Мельников и другие члены группы участвовали в разгроме полицейского участка в Кобылянке, поджоге моста через реку Уза и других боевых операциях.*

*В июне 1943 года гитлеровцы выследили и схватили в доме № 5 по улице Ленина Л. И. Дегиревского и хозяйку этой конспиративной квартиры, работницу швейной фабрики И. С. Езерскую. Их жестоко пытали. Мужественные патриоты погибли, но не выдали боевых товарищей*.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у фондзе Гомельскага партыйна-камсамольскага падполля захоўваюцца ўспаміны С. Р. Дарашэнкі, напісаныя ў пачатку 1970-х гг., у час працы Камісіі па прызнанні дзейнасці Гомельскага партыйна-камсамольскага падполля. З іх можна атрымаць наступныя звесткі: Сямён Раманавіч Дарашэнка, 1901 г.н., украінец, член ВКП(б) з 1931 г., адукацыя вышэйшая. Да вайны камандаваў сапёрным батальёнам. Ён успамінаў: *"В начале апреля 1941 года меня перебросили по службе со своим батальоном в Пинск в д. Жабчицы для строительства аэродрома, строительство аэродрома подходило к концу, — а 22 июня вероломно фашистская Германия напала на нашу родину, дальнейшее строительство было прекращено. 4.07.1941 г. по распоряжению военного коменданта станции Лунинец я прибыл со своим батальоном на ст. Лунинец, погрузился в эшелон и эшелон направлен на ст. Гомель, по прибытию на ст. Гомель военный комендант ст. Гомель связал меня по телефону с командующим 21-й армией, который отдал распоряжение коменданту ст. Гомель отправить эшелон с моим батальоном на ст. Добруш, в лес, где батальон готовился строить мосты через речные преграды на р. Ипуть, а 12 июля на рассвете походным маршем выступил на запад в район Жлобин — Рогачева в распоряжение командира 63-го СК ген. л-та Петровского для строительства мостов через р. Днепр в районе д. Лебедевка, г. Жлобин ид. Лучин. По роду своей работы я был связан с председателем Жлобинского райисполкома т. Дегиревским Л. О. 3 августа 1941 г. я был тяжело ранен и отправлен в полевой госпиталь, который располагался* в *школе д. Майское, а 18.08.41 г. 63-й корпус попал в окружение и там же оказался и госпиталь. Немцы бомбили деревню и госпиталь, раненые, которые могли двигаться, уходили в лес. а тяжелораненых разбирали граждане из разных деревень, в том числе и меня взяли из госпиталя гр. Можейко Петр Анисимович, который учительствовал в д. Асиновка — дер. Фундолина Чечерского р-на... В конце октября*

*1941 г. я встретился в квартире учителя Можейко П. А. с тов. Дегиревским Л. О. и Можейко Е. А.".*

У канцы 1941 г. Дарашэнка разам з Дзегірэўскім і Мажэйкам пераехалі ў Гомель, дзе стварылі падпольную групу. Дзегірэўскі займаўся рэмонтам абутку, а Дарашэнка кравецтвам. Вось як пра гэта ўспамінаў С. Р. Дарашэнка: *"В подпольную группу входили члены ВКП(б) тов. Дегиревкий Л. О.*, *Можейко Евстафий Анисимович, Чужов Василий Юрьевич, Мельников С. В., Федоров Иван Константинович, Поляков Семен Федорович, Поляков Ф. А., Дорошенко С .Р.*

*В работе подпольной группы принимали активное участие беспартийные товарищи; Цуканов Анатолий Петрович, Станкевич (ветврач). Азерская (Езерская) Ирина Семеновна, Азерская Ксения, Можейко Петр Анисимович, Беспаликов А. С., Утко С. Л., Мельникова, Галко Черная (Шатило Галина Петровна, Дорошенко Мария Степановна*).

Абставіны свайго арышту Дарашэнка тлумачыў наступным чынам: *"Для практической и конкретной деятельности подпольно-партийной группы был направлен в штаб партизанского движения Гомельской области Чижов В. Ю., который остался при штабе, а вместо Чижова прибыл молодой парень, фамилию его не знаю, но он оказался предателем, и в августе м-це 1943 г. я и другие шли к тов. Дегиревскому для информации результатов бомбежки нашими само-летами не доходя до его квартиры, а я шел и нес в ремонт туфли, мне сказала соседка, что сапожника арестовали, а в его квартире сидят СД и кто приходит к нему всех арестовывают. Я не успел отойти от кв. Дегиревского, как меня задержали и повезли в СД, со мной были задержаны Цуканов, Езерская".*

На допыце Дарашэнку задавалі пытанне, адкуль ён ведае Дзегірэўскага. Ён адказаў, што ведае яго як шаўца. На вочнай стаўцы Дзегірэўскі пацвердзіў, што ведае Дарашэнку як заказчыка. У час адной з прагулак Дзегірэўскі папярэдзіў, што ўзяў усю віну на сябе, і што яго выдаў чалавек, які прыйшоў са штаба партызанскага злучэння замест Чыжова: *"В конце августа 1943 г. меня, Цуканова и Озерскую с дочерью освободили, а тов. Дегиревский оставался еще в тюрьме и очевидно он погиб в застенках СД. В городе свирепствовала жандармерия и гестапо и дальше оставаться в городе было невозможно и все члены подпольной группы ушли из города в леса...".* Пасля вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў С. Р. Дарашэнка пайшоў на фронт. У Гомель ён вярнуўся толькі ў 1947 г.

Што тычыцца Я. Панова, то намі ўстаноўлена, што гэта **Яфім Фёдаравіч Папоў,** які пасля вызвалення Гомеля даў наступныя паказанні аб сваім знаходжанні ў Гомельскай турме: "*...С 23 сентября немцы начали массовое истребление заключенных. В тюрьму беспрерывно въезжали автомашины, на которые погружали заключенных и вывозили на расстрел. 28 сентября гестаповцы вывоз людей прекратили в связи с тем, что к Новобелице подходили советские части, и начали расстреливать во дворе тюрьмы. Людей по одному подгоняли к двум большим ямам во дворе тюрьмы и расстреливали. Это ужасное зрелище продолжалось весь день... На моих глазах расстреляли не менее 200 заключенных. Расстрел прекратили только после того, как обе ямы были наполнены трупами и расстрелянных девать было некуда...*".

У надпісах на сцяне **камеры № 14** (верагодна, чацвёртага корпуса) ёсць звесткі аб трох асобах, сярод якіх **Мікалай Талкачоў.**

У першай кнізе хронікі "Памяць" г. Гомеля ў спісе членаў падпольнай разведгрупы "Радзіма" НКДБ БССР,

якой кіраваў Міхаіл Іванавіч Філімонаў, пазначаны Талкачоў Мікалай Фёдаравіч (1923 г. н.), член групы з мая па лістапад 1943 г., а таксама Талкачоў Фёдар Іванавіч (1903 г. н.), сувязны трупы з мая па лістапад 1943 г.

У другой кнізе хронікі "Памяць" г. Гомеля ў спісе загінулых удзельнікаў народнага апалчэння, падпольшчыкаў і партызан ёсць звесткі аб двух Талкачовых, падпольшчыках спецгрупы "Радзіма" НКУС СССР, расстраляных у лістападзе 1943 г.: Талкачове Мікалаю Фёдаравічу і Талкачове Фёдару Іванавічу. Відавочна, што гаворка ідзе аб адных і тых жа асобах.

Паводле даных псторыка А. К. Салаўёва, спецгрупа НКДБ БССР "Радзіма" была накіравана ў тыл ворага 24 сакавіка 1943 г. у складзе трох чалавек (кіраўнік групы маёр М. І. Філімонаў). Група дзейнічала на тэрыторыі Кармянскага, Буда-Кашалёўскага, Журавіцкага, Чачэрскага. Свяцілавіцкага і Веткаўскага раёнаў Гомельскай вобласці. Разведчыкамі спецгрупы праз створаную імі агентурную сетку была сабрана значная разведвальная інфармацыя аб варожых гарнізонах, аказана дапамога партызанскім атрадам па выяўленні варожай агентуры. Таксама было праведзена некалькі дыверсій, сярод якіх - узрыў воданапорнай вежы на станцыі Буда-Кашалёва 12 верасня 1943 г., падрыў гаража ваеннай камендатуры ў мястэчку Свяцілавічы. 10 кастрычніка 1943 г. спецгрупа "Радзіма" злучылася з часцямі Чырвонай арміі. У кнізе "Щит и меч Отечества" гаворыцца аб тым, што спецгрупа "Радзіма" выляцела ў тыл у маі 1943 г.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у спісе гомельскіх падпольшчыкаў з разведгрупы "Радзіма" сярод 10 членаў пазначаны:

Талкачоў Мікалай Федаравіч (1923 г. н.), ураджэнец в. Сапрыкі Чачэрскага раёна, які падчас нацысцкай акупацыі працаваў у гомельскім маслапроме. Выконваў заданні па зборы разведвальных даных. У групе з мая па лістапад 1943 г.

Талкачоў Фёдар Іванавіч (1903 г. н.), ураджэнец в. Сапрыкі Чачэрскага раёна, які падчас нацысцкай акупацыі працаваў бухгалтерам у Чачэрскай раён- най управе. У групе з мая па лістапад 1943 г. З лета 1943 г. сувязны ў групе разведкі.

У **камеры** № **18** (чацвёртага корпуса) у надпісе на сцяне пазначаны імёны **Рыгора, Анікея, Галіны Шугалёвых.** Мяркуючы па змесце, запіс зрабіў хтосьці з сакамернікаў, хто ведаў аб лёсе сям'і Шугалёвых. З тэксту надпісу відавочна, што Шугалёвы былі расстраляныя 25 верасня 1943 г. за сувязь з партызанамі. Аўтар запісу, верагодна, не ведаў імёнаў усіх членаў сям'і, таму канстатаваў *"и ост[альная] семья".*

Пошук звестак аб асобах, якія ўзгадваюцца ў надпісе, мы пачалі з хронікі "Памяць” Веткаўскага раёна. У ёй у спісе загінулых партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў антыфашысцкага руху, асоб, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, членаў іх сем'яў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, пазначаны наступныя жыхары в. Сівенка Веткаўскага раёна: *"Шугалеева Варвара Анікееўна,* ***Шугалеева Ганна Цярэнцьеўна,*** *Шугалеева Еўдакія Яўхімаўна, Шугалеева Хрысціна Сафронаўна.* ***Шугалееў Анікей Сцяпанавіч Шугалееў Рыгор Анікеевіч.*** Можна меркаваиь што Шугалеева Варвара Анікееўна (дачка Анікея Сояпанавіча і Ганны Цярэнцьеўны) таксама запнула ў турме г. Гомеля. На жаль, знайсці якія-небудзь звесткі аб гэтым у кнізе "Памяць" не ўдалося.

Сярод 188 воінаў - землякоў жыхароў в. Сівенка, якія загінулі альбо зніклі без вестак, значыцца Шугалееў Майсей Анікеевіч (напэўна, сын Анікея), радавы, загінуў 29 снежня 1944 г. падчас

вызваленчых баёў на тэрыторыі Латвіі. Такім чынам, можна зрабіць Васнову, што 25 верасня 1943 г. у Гомельскай турме была расстраляна сям'я Шугалеевых: Анікей Сцяпанавіч (бацька), Ганна Цярэнцьеўна (маці), Рыгор Анікеевіч (сын) і Варвара Анікееўна (дачка). Яшчэ адзін іх сын (?) Маісей Анікеевіч пазбегнуў арышту і загінуў на тэрыторыі Латвіі ў снежні 1944 г.

Звесткі аб абставінах гібелі аднаго з Шугалеевых маюцца ў матэрыялах следчай справы на былога наглядчыка Гомельскай турмы А. І. Лазбекіна, які на допыце 10 студзеня 1944 г. даў падрабязныя звесткі аб апошніх днях існавання Гомельскай турмы пры нацысцкай акупацыі. Згодна з імі, Шугалееў і шэраг іншых вязняў, якія знаходзіліся ў корпусе СД, расстраляныя 25 верасня 1943 г. непасрэдна ў турме ў спецыяльна выкапанай для гэтага яме: *“Из числа расстрелянных из корпуса "СД" я помню некоторых по фамилии — Кулинкин, Худалеев — старик, Стасенко, **Иванов** и **Шугалеев,** все они в тюрьму поступили из районов, но из каких, я сказать не могу”.*

З 17 асоб, прозвішчы якіх былі пазначаныя на сцяне **камеры № 2** (корпуса №2), можна гаварыць пакуль аб чатырох асобах: **Пастушонку Андрэю Пятровічу, Драбышэўскім Фёдару Рыгоравічу, Аляксеенку Аляксею Калінавічу** і **Глушакове У.**

Аб першых двух мы даведваемся з надпісаў, што яны паходзяць з Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці: першы — з в. Отар, другі — з в. Дуброўка, абодва расстраляныя 26 верасня 1943 г. Мяркуючы на выяўленых намі звестках, іх лёс можа служыць прыкладам патрыятычнага выканання свайго абавязку па абароне Радзімы.

Паколькі на Пастушэнку і Драбышэўскага меліся амаль поўныя “ўстановачныя даныя”, іх лёс не мог не зацікавіць аператыўны аддзел ТУ НКУС СССР, адкуль паступіў адпаведны запыт па месцы жыхарства. Адказ прыйшоў у красавіку 1945 г. за подпісамі супрацоўнікаў Чачэрскага раённага адцзела НКДБ — начальніка капітана Варанцова і аперупаўнаважанага старшага лейтэнанта дзяржбяспекі Алеева: *"На Ваш №... от 28.11.1945 сообщаем, что **Пастушенко Андрей Петрович** в период немецкой оккупации проживал по месту рождения вд. Оторе Чечерского района Гомельской области. В 1943 г. Пастушенко арестован немцами, о судьбе последнего никто ничего не знает".*

У хроніцы "Памяць" Чачэрскага раёна ў спісе загінулых партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў антыфашысцкага руху в. Отар, Отарскага сельсавета пазначаны Пастушэнка Андрэй Пятровіч, 1912 г. н. Пры гэтым у той жа кнізе ў спісе воінаў-землякоў, якія загінулі альбо зніклі без вестак у 1941-1944 гг., сярод 73 чалавек значыцца таксама Пастушэнка Андрэй Пятровіч, 1914 г. н., які загінуў у 1941 г. Высветліць, ідзе гаворка аб адным чалавеку альбо аб двух розных людзях, пакуль не выявілася магчымым. На жаль, у гэтай справе хроніка "Памяць" з'яўляецца не вельмі надзейнай крыніцай. Так, у артыкуле аб в. Отар на адной і той жа старонцы гаворыцца аб тым, што ў Вялікую Айчынную вайну ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінулі 462 землякі, а праз некалькі радкоў — аб тым, што на адлегласці 1,5 км на захад ад вёскі ёсць помнік на ўшанаванне памяці 469 вяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і 213 мірных жыхароў, закатаваных захопнікамі ў 1941 г. і лістападзе 1943 г.

На гэтым помніку сярод іншых пазначаны наступныя прозвішчы:

- **Пастушэнка Андрэй Пятровіч,** н. у 1912;
- Пастушэнка Арына

Аляксееўна, н. у 1876 (маці?);

- Пастушэнка Валя Андрэеўна, н. у 1938 (дачка?);

- Пастушэнка Леанід Андрэевіч, н. у 1940 (сын?);

- Пастушэнка Раіса Аляксееўна, н. у 1911 (жонка?).

Відавочна, што гітлераўцамі была поўнасцю знішчана сям'я А. П. Пастушэнкі. Таксама відавочна, што А. П. Пастушэнка быў звязаны з партызанамі. На жаль, у картатэцы партызан і падпольшчыкаў Беларусі звестак аб ім няма. Магчыма, гэты чалавек быў звязаны з адной са спецгрупп НКУС — НКДБ альбо Разведвальнага ўпраўлення Чырвонай арміі.

Некаторыя факты аб сям'і А. П. Пастушэнкі па ведаміла жыхарка г. Гомеля Ганна Яфімаўна Піляк: *"Когда началась война, мне было 18 лет. Я с родителями проживала в д. Отор. Пастушенко жили в нескольких домах (5-6) от нас. Андрей Петрович дружил с моими старшими братьями Алексеем (пропал без вести на фронте, перед войной служил в воздушно-десантных войсках в Москве) и Егором (с войны пришел инвалидом, без ноги. Работал учителем под Минском). Пастушенко был намного старше меня. Где он работал до войны, я не знаю. Может, и в Гомеле. Знаю, что у него была жена Рая и двое очень красивых детей; мальчик Леня и девочка (имени не помню). Рая была еврейкой. Они во время оккупации жили в деревне, однако никто [на них] не донес. Раю арестовали перед приходом Красной армии. Кого ещё арестовали тогда из жителей деревни, я не знаю...".*

У адказе за подпісамі Варанцова І Алеева ёсць таксама звесткі **аб Ф. Р. Драбышэўскім:** *"Сообщаем, что* **Дробышевский Федор Григорьевич,** *1919 г. р., д. Дубровка, в годы оккупации служил медфельдшером при Дудничской больнице. 6 августа 1943 г. немецкими властями был совместно с женой арестован и содержался в тюрьме г. Гомель до 26. IX. За связь с партизанами был расстрелян. Проверкой установлено, что Дробышевский с момента ареста немецкими властями в д. Дубровка не появлялся, и о его судьбе как жена, а также родители по настоящее время не знают".*

У хроніцы "Памяць" Чачэрскага раёна ў спісе загінулых партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў антыфашысцкага руху з в. Дуброўка Ноўхавіцкага сельсавета сярод трох загінулых значыцца **Драбышэўскі Фёдар Г.,** 1917 г. н. Як бачна, і ў гэтым выпадку кніга не высвятляе сітуацыю, Уяўляецца, што прыведзены вышэй адказ за подпісамі Варанцова і Алеева ўтрымлівае больш дакладныя звесткі. Мы спадзяемся на тое, што пасля апублікавання дадзенага артыкула адгукнецца хтосьці з землякоў Ф. Драбышэўскага, які валодае больш поўнай інфармацыяй аб гэтым чалавеку, Як вынікае з кнігі "Памяць", у 1990 г. у в. Дуброўка было 34 двары, 57 жыхароў. Аднак у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС яна была адселена.

Інфармацыя аб яшчэ адным чалавеку, прозвішча якога было напісана на сцяне камеры, знайшлася пасля публікацыі ў газеце "Гомельская праўда" ад 6 красавіка 2013 г. артыкула аб надпісах на сценах Гомельскай турмы. Аўтару артыкула патэлефанаваў жыхар г. Гомеля Курпянкоў Аляксей Пятровіч (1948 г. н.) і які паведаміў, што **Аляксеенка Аляксей Калінавіч** — яго дзядзька, ураджэнец в. Отар Чачэрскага раёна. Нарадзіўся ёнпрыкладнаў 1918-1919 гг., у гады вайны жыў у роднай вёсцы і быў звязаны з партызанамі. Летам 1943 г. яго і яшчэ чатырох падпольшчыкаў арыштавалі акупанты і адвезлі ў Чачэрскую турму. Таксама А. П. Курпянкоў расказаў, што ў яго

дзядзькі была рацыя, праз якую перадавалі звесткі ў Маскву. Выдаў жа яго і іншых падпольшчыкаў мясцовы жыхар. Пасля вайны гэты чалавек быў прыгавораны да турэмнага зняволення тэрмінам 15 гадоў і поўнасцю адбыў свой тэрмін пакарання. Пасля размовы з Аляксеем Пятровічам я яшчэ раз звярнуўся да хронікі "Памяць" Чачэрскага раёна і знайшоў у спісе прозвішчаў 73 воінаў-землякоў, якія загінулі альбо зніклі без вестак у 1941-1945 гг., наступны запіс: *"Аляксеенка Аляксей Калінавіч, н. у 1912, лейт., прапаў без вестак 7. 1943".*

Аб лесе чацвёртага вязня з камеры № 2 — **Глушакова У.** — надпіс на сцяне нічога не паведамляе. Не шукала гэтага чалавека і Турэмнае ўпраўленне НКУС. Аднак па шэрагу абставін на сённяшні дзень мы ведаем аб ім нашмат болей, чым аб першых двух. Нарадзіўся ГлушакоўУладзімір Максімавіч у 1913 г. у г. Гомель. Закончыў 7 класаў, у 1936 г. — Мінскае пяхотнае вучылішча. Член ВКП(б) з 1931 г. У пачатку вайны служыў у Ваўкавыску на пасадзе памочніка начальніка 1-га аддзела штаба механізаванай дывізіі. У раёне Навагрудка трапіў у акружэнне, пазней у Мінску трапіў у палон, адкуль здолеў уцячы. З пачатку верасня 1941 г. жыў у Гомелі.

Дзякуючы дзейнасці савецкіх праваахоўных органаў стала вядома гісторыя яго злачынства, за якое ў 1945 г. ён быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Са следчых матэрыялаў бачна, што адной з прычын правалаў Гомельскага падполля, масавых артыштаў і гібелі савецкіх патрыётаўз'яўлялася дзейнасць гітлераўскіх спецслужбаў і асабліва "Абвергрупы-315", якой удалося ўвесці ў склад падполля сваіх агентаў, у прыватнасці і У. Глушакова.

З матэрыялаў, якія меліся ва УКДБ, вынікае, што ў студзені 1942 г. асабовы склад нацысцкага контрразведвальнага органа "Абвергрупа-315" (умоўна называлася аддзяленнем "ГМ" (Гаўптман Мюлер) передысцлацыраваўся са Смаленска ў Гомель, дзе знаходзіўся да верасня 1943 г. Кіраўніцтва групы складалі:

Дрэйс, альбо Дрэўс Іосіф, альбо Ота, мянушка "Мюлер" — капітан (гаўптман), начальнік з сакавіка да красавіка 1943 г.;

Цынт, ён жа Кімфер Франк — оберлейтэнант, начальна з красавіка — чэрвеня 1943 г.;

Крахт Вільгельм — зондэрфюрэр, намеснік начальніка да кастрычніка 1942 г.

Гартман Курт — фельдфебель, намеснік начальніка з кастрычніка 1942 г.

"Абвергрупа-315" праводзіла работу па выяўленні закінутых у тыл немцаў аператыўна-чэкісцкіх груп, савецкага патрыятычнага падполля, ажыццяўляла арышты, следствы, займалася вярбоўкай і перавярбоўкай агентуры, дэзінфармацыяй савецкага камандавання праз паравербаваных агентаў, уводзіла сваю агентуру ў склад патрыятычнага падполля і партызанскіх атрадаў.

Неабходна адзначыць, што савецкія праваахоўныя органы правялі вялікую працу па расследаванні дзейнасці "Абвергрупы-315". Арышт шэрагу агентаў, а таксама двух кіраўнікоў групы (В. Крахта і К. Гартмана) дазволіў назапасіць вялікі матэрыял па факце раскрыцця нямецкімі карнымі органамі ў 1942 г. патрыятычнага падполля і рэпрэсіях у адносінах да савецкіх патрыётаў. Ён сведчыць аб тым, што напярэдадні акупацыі нямецкімі войскамі Гомеля для барацьбы ў тыле ворага тут было пакінута некалькі разведвальна-дыверсійных груп. Адну этакіх груп у ліпені 1941 г. укамплектаваў супрацоўнік УНКДБ Гомельскай вобласці лейтэнант дзяржбяспекі Мікалай Міхайлавіч Гарохаў. Узначаліў гэтую групу Канстанцін Мікалаевіч Сакалоў (1906 г.

н., ураджэнец Кіева, адукацыя вышэйшая), які працаваў галоўным інжынерам гсмельскага завода "Дэзапаратура". Яго прызначэнне сведчыла аб станоўчым стаўленні да яго з боку супрацоўнікаў УНКДБ, нават нягледзячы на тое, што раней ен прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. У дыверсійную трупу Сакалова першапачаткова былі ўключаны тры чалавекі: А. І. Шарыхін (1892 г. н.), А. Скарына (Скарынок) (1913 г. н.), Р. Ф. Крупадзёраў 1923 г. н.). Перад групай Сакалова была пастаўлена задача займацца дыверсіямі на чыгуначным транспарце, праводзіць разведвальную дзейнасць і ажыццяўляць фізічнае знішчэнне асоб, якія актыўна дапамагалі гітлераўцам. Да вясны 1942 г. трупа папоўнілася шэрагам патрыятычна настроеных жыхароў Гомеля. якія працавалі на розных прадпрыемствах, у тым ліку на паравозавагонарамонтным заводзе. У склад групы быў залічаны і У. Глушакоў.

У пачатку лета 1942 г. кіраўнік групы К. М. Сакалоў быў арыштаваны "Абвергрупай-315" і пасля допытаў даў згоду на супрацоўніцтва з гітлераўцамі. Пры гэтым ён выдаў увесь склад групы. У далейшым К. М. Сакалоў стаў супрацоўнічаць таксама з гомельскім СД і, паводле шматлікіх паказанняўсведкаў, з'яўляўся адным з жорсткіх следчых, прымаў актыўны ўдзел у катаваннях і расстрэлах падпольшчыкаў. Сваю дзейнасць працягваў да канца вайны, пасля яе заканчэння апыўнуўся ў амерыканскай зоне акупацыі і быў рэпатрыяваны ў савецкую зону акупацыі. Знаходзячыся ў зборна-перасыльным пункце г. Будапешта, ён паведаміў прадстаўнікам органаў дзяржбяспекі СССР, што з’яўляецца агентам савецкіх спецслужбаў, і напісаў дакладную запіску аб сваёй дзейнасці ў Гомелі падчас акупацыі. Пакуль ішла праверка гэтай інфармацыі. Сакалову ўдалося ўцячы са зборнага пункта. Далейшы яго лёс невядомы.

У сваіх паказаннях К. М. Сакалоў пісаў, што ў яго групу ўваходзілі таксама Алейнікаў і француз Таран Оранцуа. Першы з іх захоўваў у сваім доме радыёстанцыю. а другі з’яўляўся радыстам. Іх адрасы і паролі сувязі Сакалоў атрымаў ад Гарохава. Таксама ён заяўляў, што Гарохаў даручаў яму ўмацоўваць сваю групу і пры зручным выпадку ўвайсці ў разведвальныя органы нацысцкай Германіі.

У выкананне пастаўленых задач Сакалоў, як вынікае з яго тлумачэнняў, прыцягнуў у сваю групу Мурашку Аляксея Фёдаравіча, з якім быў знаёмы па сумеснай рабоце на заводзе "Дэзапаратура"; Кавалёва Івана, былога сакратара партарганізацыі мехцэха завода імя Кірава, быццам пакінутага ў тыле ворага для падпольнай працы і страціўшата сувязь са сваёй групай; **Глушакова Уладзіміра Максімавіча,** які працаваў на паравозавагонарамонтным заводзе. а таксама членаў сям’і Кавалёва і сваіх родзічаў па жонцы — Абросімавых.

Пасля заняцця Гомеля немцамі Сакалоў спачатку працаваў машыністам на чыгуначнай вадакачцы, а ў студзені 1942 г. перайшоў працаваць такелажнікам на паравозавагона-рамонтны завод. Члены групы арганізавалі на гэтых аб’ектах асобныя дыверсіі, займаліся зборам зброі і ўзрыўчаткі, правядзеннем антыфашысцкай прапаганды. У сваіх тлумачэннях Сакалоў адзначаў, што 17-18 лютага 1942 г. член яго групы Кавалёў правёў узрыў чыгуначнага палатна, 20-21 лютага Кавалёў разам са Скарынам падарвалі чыгуначны пуць паміж станцыяй Гомель і мостам цераз р. Сож, у сакавіку 1942 г. ён разам з Кавалёвым і Скарынам здзейсніў падрыў чыгуначнага палатна на сартавальнай пляцоўцы каля Палескага пераезда, праз некалькі дзён Кавалёў падарваў чыгуначны шлях на станцыі Злынка, а 15-16 красавіка 1942 г. Сакалоў і Скарына здзейснілі дыверсію на шашы

Добруш – Злынка.

Даныя аб тым, што ў групу Сакалова ўваходзілі Скарына, Кавалёў, Мурашка і Глушакоў, пацвярджаюцца паказаннямі Мурашкі, Глушакова і афіцыйных асоб нямецка-фашысцкага контрразведвальнага органа "Абвергрупа-315" В. Крахта і К. Гартмана.

Паводле сведчанняў Сакалова і Мурашкі, яны разам са Скарынам з мэтай устанаўлення сувязі з партызанамі і забеспячэння бяспекі родных на выпадак правалу групы выехалі вясной 1942 г. у г. Новазыбкаў, дзе ўладкаваліся на працу па аднаўленні аднаго з заводаў.

У пачатку лета 1942 г. Сакалоў I Мурашка былі арыштаваныя ў Новазыбкаве супрацоўнікамі "Абвергрупы-315" і дастаўлены ў Гомель. Тут ім была арганізавана вочная сустрэча з У. М. Глушаковым, які быў арыштаваны некалькі раней, у чэрвені 1942 г. Інфармацыю аб далейшым развіцці падзей мы атрымліваем з пратаколу допыту У. М. Глушакова следчым НКДБ СССР старшым лейтэнантам дзяржбяспекі Сарокіным ад 24 студзеня 1944 г. Працыгуем тэты пратакол;

***"Вопрос: Расскажите о связи с немецкой разведкой и своей практической преступной работе.***

***<u>Ответ</u>:*** *Началу установления связи с немецкой разведкой и моей практической преступной работы предшествовали следующие обстоятельства. Проживая в г. Гомеле, в ноябре месяце 1941 г. я встретился на рынке со своим старым знакомым бывшим работником политотдела Белорусских железных дорог — Алейниковым Василием Николаевичем", с которым беседовал по вопросам международного положения. После этого я с ним встречался еще несколько раз в моем доме, у него на квартире. В первых числах января 1942 г. встретившись с Алейниковым, он мне сказал, что здесь в г. Гомель проживает некий Соколов Константин Николаевич - бывший, кажется, инженер завода "Пролетарий" города Гомеля, оставленный в тылу врага органами НКВД и обкома ВКП(б) для проведения диверсионной работы. Одновременно Алейников сделал мне предложение принять участие вместе с ним в диверсионной работе. Я согласился, после чего Алейников через несколько дней познакомил меня с Соколовым К. Н. и Мурашко Алексеем, отчество не знаю, в прошлом работавшим где-то техником. Знакомство с Соколовым и Мурашко произошло на рынке* г. *Гомеля. После того, как познакомились, беседовали около 2-х часов, прохаживаясь по улицам г. Гомеля. Соколов подтвердил слова Алейникова и рассказал, что он действительно оставлен в тылу врага для проведения диверсионной работы, остановился на задачах, что мы должны делать, в частности он сказал, чтобы я, как рабочий завода, организовал диверсионную группу из числа близко знакомых людей. Выполняя задания Соколова, я на заводе организовал диверсионную группу из числа рабочих в количестве 15 человек, в которую персонально вошли: Пивоваров Николай, Бегунов Михаил, Ясинский Владимир, Киржанов Григорий, Путейко Иван, Майков Петр, Яков — фамилии не помню, Ковалев Иван. Фамилии других запамятовал, постараюсь вспомнить и показать о них на следующем допросе. О каждом участнике диверсионной группы я давал отчет Соколову, который приходил ко мне в цех, беседовал со мною о предстоящей диверсионной работе и чтобы я как руководитель группы соблюдал конспирацию. Он же иногда устно мне передавал сообщения Сов. информбюро о победах Красной Армии и поражении немецких*

*частей, которые, по совету Соколова, передавались мною участникам группы.*

*В начале мая 1942* г. *Соколов и Мурашко пришли ко мне на квартиру и принесли мне на хранение 10 толовых шашек с капсулами, пистолет, нерусской марки, 45 патронов. Тут же Соколов сказал, что они переезжают в г. Новозыбков для работы строительного монтажного цеха восстанавливающейся спичечной фабрики "Волна революции". Меня предупредил, чтобы я был готовым к переезду к ним в качестве шофера. Далее Соколов сказал, что там, в гор. Новозыбкове, легче будет связаться с партизанами. Более месяца с Соколовым я не встречался.* ***19 июня 1942 года я был арестован немецкой контрразведкой и заключен под стражу в тюрьму гор. Гомеля.*** *20 июня 1942 г., т. е. на другой день после ареста, я был вызван на допрос к зондерфюреру* ***Крахт Вилли,*** *который потребовал от меня показаний об оружии, толовых шашках и диверсионной группе на заводе "ПВРЗ". Показаний по указанным вопросам я не дал. Крахт несколько раз ударил меня резиновой палкой и отправил в камеру. Спустя час я снова был вызван на допрос к Крахту, в комнате которого находились Соколов и Мурашко. Крахт задал мне те же самые вопросы, что и задавал на первом допросе. Я сначала ответил отрицательно, но потом Соколов встал и сказал в моем присутствии, что я являюсь начальником диверсионной группы на заводе, созданной по его заданию, что пистолет и тол находятся у меня под дровами в сарае родителей. Я был вынужден под уликами Соколова признаться, что я действительно являюсь начальником диверсионной группы, созданной по его заданию, и что тол и пистолет находятся у меня под дровами в сарае. После моего признания я был отправлен в камеру, где находился примерно полчаса, а затем вновь был вызван, посажен в автомашину, на которой возили меня на мою квартиру по изъятию тола и оружия. После изъятия у меня тола и оружия возвратились обратно и я был отправлен в камеру, где находился без дальнейшего следствия 36 суток. На тридцать седьмые сутки начальник караула Сковпин Николай вывел меня во двор тюрьмы, где находился зондерфюрер Крахт, два немецких солдата с автоматами и один гражданский, русский по национальности. В моем приближении к названным лицам Крахт подошел ко мне, а солдаты встали со скамьи и зарядили автоматы. Я сильно перепугался, думая, что меня расстреляют, а Крахт в этот момент спросил меня, знаю ли я Валю. Я ответил: "Знаю. Около меня живут две Вали, Анищенко и Плеханова". После этого Крахт спросил, кто ночевал у меня из гор. Минска. Я дал отрицательный ответ. Далее Крахт сказал мне, чтобы я шел домой. Я этому не поверил и стоял на месте, тогда Крахт взял меня за рукав и повел в караульное помещение, где Крахт расписался за мое освобождение. С перепугу я заболел и с приходом домой пролежал 15 дней. На 4-5 день моей болезни ко мне домой приезжал Крахт, но узнав от матери, что я больной, ушел. После выздоровления, т. е. в первой половине августа месяца 1942 г. ко мне на квартиру пришел тот самый гражданский человек, который присутствовал при моем освобождении и сказал, чтобы я с ним пошел, куда не сказал. Названный человек, как стало мне известно впоследствии, оказался Борисовым Константином Васильевичем, работавшим агентом немецких контрразведывательных органов — "Абвергруппа-315". Последний привел меня на одну из конспиративных*

квартир "Абвергруппы-315" по Советской ул., дом 79, где к тому моменту был Крахт и зондерфюрер Гартман Крахт, расспросив биографические данные, сказал мне о том, что я стоял одной ногой в могиле, а Гартман дополнил Крахта и заявил: "На могиле вы стояли не одной, а двумя ногами. Но мы не НКВД, людей не расстреливаем". После этого Крахт заявил мне о том, что я буду работать на них и тут же отправил домой. Через неделю ко мне пришел Борисов К. В. и принес удостоверение, в котором было написано, что я являюсь работником немецкой воинской части, которому должны оказывать помощь другие воинские части и гражданские организации. В случае задержания меня справляться в штабе дивизии 1-СП. Вскоре после этого жандарм по прозвищу "Малай", являющийся агентом "Абвергруппы-315" привел мне лошадь и сказал, чтобы я за нею ухаживал. Лошадь у меня находилась до конца декабря 1942 года. За период с августа по декабрь 1942 г. я выполнял отдельные задания "Абвергруппы-315", как то: ходил на рынок и по приметам устанавливал нужных людей разыскивал ракетчиков.

3 начале января м-ца 1943 г. меня вызвал Гартман конспиративную квартиру по ул. Сталина, дом 9 и заявил мне о том, что я должен опять работать: своею диверсионной группой, которая мною была создана на заводе. Выполняя задание Гартмана, - встретился с Пивоваровым Николаем — рабочим завода, которому поручил сообщить всем участникам, что группа будет продолжать свою диверсионную работу, что начальником этой группы остается — Глушаков. С Пивоваровым я встречался неоднократно на своей и его квартирах. Последний передал мне, что диверсионная группа сохранилась в одном составе за исключением ранее арестованных 4-х человек. В этом же месяце, т. е. январе 1943 года я получил от Гартмана 5 советских листов, которые по установке Гартмана в целях провокации мною были переданы Пивоварову для распространения среди участников диверсионной группы. Листовки, как мне сообщил Пивоваров, были распространены. Содержание листов сводилось к перечислению побед Красной Армии и поражению немецких войск на восточном фронте.

В феврале месяце 1943 г. Гартман вызвал меня в дом. коммуны по ул. Комсомольской, где и сказал мне чтобы я пригласил к себе на квартиру участников своей диверсионной группы для проведения с ними собрания, что мною и было сделано. Ко мне пришли Пивоваров Николай, Мойков Петр, Яков ф/н (прозвішча не памятаю. — **А. Л.**) и четвертый, фамилии не знаю. Дополняю. что предлогом для сбора участников группы от Гартмана мною была получена легенда в письменном виде, содержание которой сводилось к тому, что на данном собрании будет присутствовать представитель партизанского отряда из Бобруйска или Жлобина, точно не помню. Записка с легендой мною была передана Пивоварову, на основе чего он собрал участников. Как только собрались названные мною 4-е человека, через полчаса пришел агент "Абвергруппы-315" Тихонов, имя и отчество не помню, который выдал себя за представителя партизанского отряда и беседовал с участниками о победах Красной Армии, поражении немецких войск, задачах диверсионной группы.

Часов в семь вечера того же дня, в момент происходившего собрания, в мою квартиру пришел Гартман и несколько немецких солдат. Все присутствовавшие были арестованы, причем четверо рабочих

*завода были посажены в одну машину, я и Тихонов - в другую (я с Тихоновым были арестованы для видимости, были из тюрьмы освобождены через полчаса), а о судьбе четверых мне ничего не известно. От начальника караула Диль Андрея слышал, что они якобы были этапированы из Гомеля в Бобруйск, какую-то школу. Вскоре после данного ареста были арестованы другие участники группы с завода: Ковалев Николай, Юсупов Василий, Григорий — ф/н, Николай — ф/н и др. В количестве восьми человек. Фамилии постараюсь вспомнить...*

Матэрыялы следчай справы на У. М. Глушакова сведчаць аб яго актыўнай здрадніцкай дзейнасці і ў далейшым. Так, у прыгаворы па яго справе пазначана: "*...Работая агентом немецкой контрразведки ГЛУШАКОВ, используя метод провокации, создавал подпольные группы для борьбы с оккупантами, вербуя в них советских патриотов, а затем выдавал их оккупантам.*

*Таким методом он организовал группу из рабочих гор. Гомеля, работавших на паровозовагонном ремонтном заводе и по его доносу, в феврале 1943 года, на этом заводе было арестовано 60 человек рабочих, часть из этих рабочих немцами была расстреляна.*

*В марте 1943 года ГЛУШАКОВ вместе с агентом немецкой контрразведки Третьяковской по заданию немецкой контрразведки, путём провокации выдали оккупантам 24-х человек советских граждан гор. Добруша, которые впоследствии были арестованы немцами, некоторые из них были заключены в лагерь, а Руденок и Огрызко были расстреляны.*

*В апреле 1943 года ГЛУШАКОВ вместе с Третьяковской по заданию немецкой контрразведки выезжали в гор. Климов Орловской области и проводили разведывательную работу по выявлению партизан и граждан, настроенных враждебно против оккупантов.*

*ГЛУШАКОВ выполняя шпионско-предательскую работу в гор. Климове в августе 1943 года, по заданию немецкой контрразведки, вступил в партизанский отряд и во время изгнания оккупантов с территории Орловской области остался в тылу Красной Армии для разведывательной работы в пользу германской разведки...* ".

З 24 асобаў, прозвішчы якіх былі выяўленыя на сценах **камеры № 5** (корпуса № 2), звесткі пакуль удалося знайсці толькі аб **Антоне Лявонцьевічу Барэйшу,** актыўным удзельніку Гомельскага патрыятычнага падполля, члену падпольнай групы В. С. Сідарука, якая праводзіла падпольную работу на чыгуначным вузле.

Васіль Сазіч Сідарук нарадзіўся ў 1909 г. у Баранавічах у сям'і чыгуначніка. Член ВКП(б) з 1930 г. Закончыў няпоўную сярэднюю школу ў Гомелі, у 1935 г. — Ленінградскі аўтамабільна-дарожны інстытут, быў накіраваны па размеркаванні выкладчыкам у Гомельскі аўтамабільны тэхнікум. З 1938 г. працаваў дырэктарам тэхнікума. У пачатку вайны быў прызваны ў Чырвоную армію, удзельнічаў у абарончых баях, у раёне Кіева трапіў у акружэнне. Здолеў прабрацца ў Гомель, дзе стаў шукаць сувязі з асобамі, пакінутымі ў горадзе для падпольнай работы. У матэрыялах Камісіі па прызнанні дзейнасці Гомельскага падполля прыведзена наступная інфармацыя аб В. С. Сідаруку: "*Он устроился на работу слесарем на электротехнический завод, который обслуживал главным образом нужды железнодорожного узла. К маю 1942 года он создал подпольную группу в составе коммуниста А.Л. Борейши, беспартийного рабочего Н. П. Бохана и других. Первым практическим делом участников группы было составление*

*и распространение листовок, призывавших к борьбе с захватчиками. По указанию В. С. Сидорука рабочие стали саботировать распоряжения оккупантов, систематически портить оборудование, выводить из строя семафоры, развинчивать болты у стыков рельсов и стрелок, всячески нарушать работу путевого хозяйства железнодорожного узла.*

*В сентябре 1942 года В. С. Сидорук и его товарищи подорвали поворотный круг на участке Гомель — Хозяйственный — Гомель. Вскоре группа установила связь с партизанами. С этого времени особое значение приобрела разведывательная деятельность патриотов. Подпольщики собирали подробные сведения о скоплении техники и войск на железнодорожном узле, расположении воинских частей в городе, доставляли эти данные партизанам. Весной 1943 года гитлеровцы схватили В. С. Сидорука и А. Л. Борейшу. После длительных пыток они были расстреляны".*

Член групы М. П. Бохан тры месяцы ўтрымліваўся ў турме, а затым быў пераведзены ў канцэнтрацыйны лагер, адкуль яму ўдалося збегчы. У сваіх успамінах. што захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, М. П. Бохан раскрывае некаторыя падрабязнасці правалу іх групы: *"В мае 1943 года, когда я пришел на завод на работу, Сидорука на месте не оказалось. По окончанию работы я пошел к Сидоруку на квартиру узнать, почему он не вышел на работу. Тут я узнал, что его арестовала полиция. Спустя несколько дней, в мае 1943 года прямо на заводе арестовали меня и Антона Борейшу. Когда нас арестовывали, в карманах у меня и Борейши были советские листовки. Чтобы избавиться от них, Борейша попросился у конвоиров в туалет, а вслед за ним и я. Незаметным образом я выбросил листовку в яму уборной... После этого нас привезли в тюрьму, где тщательно обыскали, но ничего не нашли и посадили в камеры. Арестовывали нас агенты ГМ, так называемая немецкая карательная организация, которая ведала борьбой с подпольщиками и партизанами. Там же находилась жандармерия и СД. В ГМ нас часто водили на допросы. При допросах сильно избивали. На одном из допросов, когда мы сидели на скамейке, Я, Борейша и Сидорук. Сидорук тихо нам шепнул: "Нас выдали". Кто выдал и когда он сказать не успел, т. к. конвойные все время за нами следили и запрещали говорить друг с другом. В тюрьме я просидел три месяца, после чего меня направили в концентрационный лагерь, который находился на Советской улице, близ еврейского кладбища... В конце октября 1943 г. меня повели из лагеря на работу по расчистке конюшен около Рогачевского рынка. Улучив момент, я убежал и скрывался в Гомеле в разных местах. Позднее я узнал, что Сидорука и Борейшу немцы перед уходом из Гомеля расстреляли в тюрьме..."*

У архіве захоўваюцца таксама ўспаміны Марыі Герасімаўны Барэйшы, жонкі А. Л. Барэйшы: *"После успешной бомбежки нашей авиации были арестованы немцами в конце марта 1943* г. *мой муж Барейша А. Л., Сидорук, Бохан. Остальных 5 человек фамилии я не знаю. Бохана Николая держали вместе с ними до конца следствия, потом отправили в рабочий лагерь, из которого он убежал впоследствии. Моего мужа и Сидорука всё время до последнего дня никуда не отпускали, только водили на допросы. При допросах страшно издевались и били: я получала его грязное белье, оно всегда было в крови от сильных побоев... 26.IX.43 г. я еще передала передачу мужу, а 27.IX.43 г. когда я утром принесла передачу опять, то мне ее*

*через некоторое время вернули назад и сказали, что такого уже нет. Когда я стала добиваться, где он, то мне с трудом удалось узнать у начальника караула, что их расстреляли вчера в 10 часов вечера...”.*

У **камеры** № **3** (корпуса № 2) выяўлены наступны надпіс: ***"Яночкин".*** Яго пакінуў **Цімафей Пятровіч Янаčкін**, вытрымка з успамінаў якога апублікавана ў хроніцы "Памяць": *"...Тюремные условия не поддаются никакому описанию. Питание было чрезвычайно скверное. В день давали 200 грамм хлеба-суррогата (из ячменных шароек и желудей) и миску супа, который состоял из воды и ложки гречневых шароек, совершенно несоленый суп. Суп этот выдавался далеко не каждый день. На прогулку людей из камер не выпускали. Только в уборную два раза в день на 5 минут. Многие заключенные сидели по нескольку месяцев (6—8) без следствия и представляли из себя хо- дящие тени, на которых было страшно смотреть...".*

Невядома, хто пакінуў наступны надпіс у **камеры** № **18** (корпуса № 1): ***"Ивановы Иван, Михаил, Валентина, Анна*** *расстреляны 25 октября 1943 г. — суббота".* Хутчэй за ўсё, тэта быў хтосьці з іх сакамернікаў.

Можна меркаваць, што менавіта аб гэтых Івановых ёсць звесткі ў другой кнізе хронікі "Памяць" г. Гомеля, дзе ў спісе загінулых мірных жыхароў, ахвяр фа- шысцкага тэрору пазначаны:

***"Іванова Валянціна Рыгораўна,*** *н. у 1922, расстраляна ў 1943.*

*Іванова Вольта Мікалаеўна, н. у 1906.*

***Іванова Ганна Раманаўна,*** *н. у 1900, расстреаляна ў 1943.*

***Іваноў Іван Рыгоравіч,*** *н. у 1920, расстраляны ў 1943.*

*Іваноў Мікалай Сяргеевіч, н. у 1881, закатаваны ў 1942.*

*Іваноў Мірон Рыгоравіч, н. у 1925, расстраляны ў 1943.*

*Іваноў Рыгор Лаўрэнцьевіч, н. у 1899, расстраляны ў 1943*.

У прыведзеным намі спісе не пазначаны Міхаіл Іваноў. Магчыма, ён пражываў не ў Гомелі, а ў адным з населеных пунктаў Гомельскай вобласці і з’яўляўся сваяком сям'і Івановых. У 1944 г. наглядчык турмы - Лазбехін у сваіх паказаннях называў прозвішча Іванова, закатаванага ў ліку іншых вязняў у яме на тэрыторыі турмы 25 верасня 1943 г., адзначаючы пры гэтым, што гэтыя вязні паходзілі не з Гомеля, а з прылеглых да яго раёнаў.

У напаўразбураных камерах былога **жаночага корпуса турмы** выяўлены наступны надпіс: ***“Лебедев Павел,*** *г. Гомель, Подгорная, 19, взяли на расстрел 24 сентября 1943 г., передайте Лебедевой Люсе”* На запыт М. Нікольскага з Гомеля 17 красавіка 1945 г. прыйшоў адказ за подпісамі начальніка 2-га аддзела УНКДБ Гомельскай вобласці маёра Лукельева, начальніка 8-га аддзялення 2-га аддзела УНКДБ ст. лейтэнанта Варонкіна: *"На Ваш запрос № 30/1082 от 26.11.1945 г. сообщаем, что проверяемый Вами* ***Лебедев Павел*** *на жительстве в г. Гомель не установлен, так как дом № 19 по ул. Подгорной сожжен, а из жителей, знающих Лебедева никого нет."*

Больш інфармацыі аб Паўлу Лебедзеве намі не выяўлена, за выключэннем звестак у другой кнізе “Памяць” г. Гомеля. У спісе загінулых мірных жыхароў г. Гомеля, ахвяр фашысцкага тэрору пазначаны *"Лебедзеў Павел Кузьміч, н. у 1923, расстраляны ў 1942".* Кім быў гэты П. Лебедзеў і як склаўся яго лёс сказаць пакуль немагчыма.

У тым жа корпусе выяўлены таксама наступны надпіс; "г. *Добруш, ул. Гомельская, дом 11 Гаврилюченко Петр сидел с 23 августа 1943 г, 25 сентября 1943 г. расстрелян (Гомельская область)".* Гэтага чалавека

таксама спрабавалі адшукаць органы НКУС. Так, у лісце Нікольскага начальніку УНКДБ Гомельскай вобласці палкоўніку дзяржбяспекі Фукіну ад 17 мая 1945 г. напісана: *"Проверкой установлено, что по адресу: г. Добруш, по ул. К. Маркса (при немцах Гомельская) д. 11 в период немецкой оккупации проживал* ***Гаврилюшенко Петр Андреевич,*** *1925* ***г.*** *р., уроженец Злынка Брянской области. В 1943 году Гаврилюшенко поступил на службу в немецкую полицию, но в августе того же года полицией был арестован за сочувствие партизанам и по непроверенным данным был, якобы, угнан немцами вглубь Германии. В г. Добруш проживает отец Гаврилюшенко Андрей Кондратьевич и сестра Матрена Андреевна, которым о месте Гаврилюшенко П. А. ничего не известно. Два брата его служат в Красной Армии. Ориентируя Вас об изложенном, просим в случае появления Гаврилюшенко в Гомельскую область установить за ним агентурное наблюдение, имея ввиду возможность заброски Гаврилюшенко П. А. немецкой разведкой на советскую территорию".*

Як склаўся лёс П. А. Гаўрылюшчанкі, нам невядома. Аднак з прыведзенага вышэй дакумента бачна, што ведамства М. І. Нікольскага рассылала арыенціроўкі на пэўных асобаў наваг праз паўтара года пасля вызвалення Гомеля.

Сярод надпісаў на сцяне ў напаўразбураных камерах былога жаночага корпуса ёсць і такі: *"Алма-Ата, Каз. ССР, Пушкинская, 25 —* ***Ершов Дмитрий Андреевич,*** *расстрелян".* У лістападзе 2013 г., амаль праз паўгода пасля названай вышэй публікацыі ў газеце "Гомельская праўда", дырэктар Гомельскага абласнога музея вайсковай славы П. Л. Ждановіч пераслаў мне ліст, атрыманы ад жыхара г. Ніжні Ноўгарад А. Д. Яршова. Гэты чалавек на працягу 70 гадоў шукае магілу свайго бацькі, які, паводле некаторых звестак, загінуў у Дулагу № 121 ў Гомелі.

У сваім лісце А. Д. Яршоў расказаў пра бацьку, Дзмітрыя Андрэевіча Яршова (1908 г. н.), які паходзіў з с. Канстанцінаўка Алма-Ацінскай вобл. Казахстанская ССР. У ліпені 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную армію, служыў у званні старшага сяржанта, займаў пасаду хімінструктара ў 425-м асобным сапёрным батальёне 413-й стралковай дывізіі. У канцы 1942 г. яго сям'я атрымала інфармацыю, што Д. А. Яршоў знік без вестак 19 лістапада 1941 г. У 1946 г. на адрас г. Алма-Ата, вул. Пушкінская, 25 прыйшоў ліст ад незнаёмага Яршовым П. М. Васільева, які паведаміў, што знаходзіўся разам з Д. А. Яршовым у лагеры для ваеннапалонных у Гомелі. Пазней, падчас асабістай сустрэчы, П. М. Васільеў расказаў, што восенню 1943 г. Д. А. Яршоў разам з яшчэ адным мужчынам здолелі ўцячы з лагера, аднак былі адшуканыя і расстраляныя. Разам з імі былі расстраляныя мірныя жыхары стары і маладая дзяўчына, якія хавалі збеглых вязняў у сваім доме і спрабавалі пераправіць іх да партызанаў. А. Д. Яршоў піша, што ў 1987 г. падчас наведвання краязнаўчага музея г. Гомеля бачыў на першым паверсе музея ў экспазіцыі "Гомель у гады вайны" фотаздымкі старога і дзяўчыны, якія, паводле інфармацыі пад здымкам, былі расстраляныя восенню 1943 г. за сувязь з партызанамі. На жаль, у той час ён не запісаў прозвішчы гэтых людзей. Сёння ён мяркуе, што гэтыя асобы маглі мець дачыненне да яго бацькі.

Найбольш поўная інфармацыя аб апошніх днях Гомельскай турмы ўтрымліваецца ў матэрыялах допыту следчым упраўлення контрразведкі "СМЕРШ" Беларускага фронту капітанам Багамазавым наглядчыка Гомельскай турмы А. І. Лазбекіна ад 10 студзеня 1944 г. У іх ёсць інфармацыя, што 26 верасня 1943 г. былі

расстраляныя апошнія вязні турмы і турма спыніла сваё існаванне. Аднак у гэтай сувязі ўзнікае пытанне аб верагоднасці прыведзенай інфармацыі, паколькі г. Гомель быў вызвалены ад акупацыі толькі праз два месяцы, 26 лістапада 1943 г. Малаверагодна, каб турма перастала існаваць за два месяцы да адыходу гітлераўскіх войскаў. Відавочна, што гісторыя Гомельскай турмы перыяду нацысцкай акупацыі патрабуе далейшага даследавання.

Пошук звестак аб людзях, чые імёны і прозвішчы былі напісаныя на сценах Гомельскай турмы падчас нацысцкай акупацыі, працягваецца. Аўтар будзе ўдзячны ўсім чытачам за любую інфармацыю.


1. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ). Ф. 9413, воп. 1, спр. 67, арк. 269.
2. Там жа. Спр. 53, арк. 2.
3. Падлічана аўтарам па: Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941—1944 / Авт.-сост. В.И.Адамушкоидр.; науч. ред. Р.П.Платонов, В.И.Адамушко. Мн., 2001.
4. ДАРФ. Ф. 9413, воп. 1, спр. 52, арк. 92—97.
5. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941 —1944. С. 29; Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (далей — ДАГВ). Ф. 1345, воп. 1, спр. 9, арк. 4, 6—8, 49—56, 80, 93, 97, 157, 159, 163—167, 174, 214.
6. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1998. С. 586.
7. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 2. Мн., 1999. С. 57.
8. Подвиг непокоренных // Советская Белоруссия. 1973, 22 июня. С. 3.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 1392. воп. 1, спр. 13, арк. 121.
10. Там жа. Спр. 19, арк. 46—48. Ліст у Гомельскі ГК КПБ І.К.Фёдарава.
11. Там жа. Спр. 13, арк. 122, 125.
12. Там жа. Арк. 122.
13. Там жа.
14. ДАГВ. Ф. 1345, воп. 1, спр. 9, арк. 138—141; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 1. С. 554
15. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 1. С. 598.
16. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 2. С. 61.
17. Соловьев А.К. Они действовали под разными псевдонимами. Мн., 1994. 189—190.
18. Щит и меч Отечества / под ред. В.И.Дементея. Мн., 2006. С. 144
19. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Веткаўскага раёна. У 2 кн. Кн. 2. Мн., 1998. С. 106.
20. Там жа. С. 242.
21. ДАГВ. Ф. 1345, воп. 1, спр. 2, арк. 19—19 адв.
22. ДАРФ. Ф. 9413, воп. 1, спр. 65, арк. 18.
23. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чачэрскага раёна. Мн., 2000. С. 307.
24. Там жа. С. 430—432.
25. Там жа. С. 600.
26. Там жа. С. 307.
27. Запіс тэлефоннай размовы з Г.Я.Піляк ад 2 мая 2013 г. Архіў аўтара.
28. ДАРФ. Ф. 9413. воп. 1, спр. 64, арк. 106—107.
29. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чачэрскага раёна. С. 305.
30. Там жа. С. 591.
31. Там жа. С. 430.
32. НАРБ. Ф. 1392. воп. 1, спр. 11, арк. 1 — 11.
33. Там жа. Спр. 9, арк. 1—8.
34. Там жа. Ф. 1345, воп. 1, спр. 11, арк. 21—22.

35. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 1. С. 587.
36. Подвиг непокоренных // Советская Белоруссия. 1973, 22 июня. С. 2.
37. НАРБ. Ф. 1392, воп. 1, спр. 1, арк. 18; спр. 12, арк. 179.
38. Там жа. Спр. 12, арк. 181.
39. Там жа. Спр. 18, арк. 67—68.
40. ДАГВ. Ф. 1345, воп. 1, спр. 9, арк. 138, 141, 169, 171, 178, 312, 318. Апублікавана ў кнізе: Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 1. С. 554.
41. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 2. С. 65.
42. ДАГВ. Ф. 1345, воп. 1, спр. 2, арк. 19-20.
43. ДАРФ. Ф. 9413, воп. 1, спр. 52, арк. 145.
44. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. Кн. 2. С. 65.
45. ДАРФ. Ф. 9413, воп. 1, спр. 64, арк. 34.
46. ДАГВ, Ф. 1345, воп. 1, спр. 2, арк. 19—21 адв.

**Аляксей ЛІТВІН**